УДК 398.332.416(476.7)

*І. В. Хамутова*

# Давыд-гарадоцкія «Конікі»: лакальная традыцыя шчадравання

*Падкрэсліваюцца адметнасць і ўнікальнасць лакальнай традыцыі шчадравання «Конікі» ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Святочная забава адносіцца да абраду абыходу двароў пераапранутымі ўдзельнікамі гуртоў, якія спяваюць шчадроўкі, граюць на шумавых музычных інструментах, жадаюць гаспадарам дабрабыту ў новым годзе. Разгледжаны асноўныя этапы абрадавага комплексу: падрыхтоўчы – выраб самаробных карнавальных вобразаў і іншай атрыбутыкі; хаджэнне шчадроўшчыкамі па хатах з паказам гумарыстычных сцэнак вечарам з 13 на 14 студзеня; завяршальны, форма якога трансфармуецца з цягам часу. Выразныя асаблівасці давыд-гарадоцкіх «Конікаў» прасочаны праз аналіз структуры і абрадавых кодаў.*

***Ключавыя словы:*** *«Конікі», шчадраванне, атрыбутыўны код, шчадроўка, кант, гісторыка-культурная каштоўнасць Рэспублікі Беларусь.*

*I. Khomoutova*

# Davyd-gorodok's "Koniki": the local tradition of caroling

*The local tradition of caroling "Koniki" in Davyd-Gorodok of Stolin District of Brest Region is a unique. It refers to the ritual of yard walking by disguised members of collectives who sing caroling songs, play noise musical instruments, wish owners well-being in the new year. The article considers the main stages of the ceremonial complex: preparatory – making homemade carnival images and other attributes; directly caroling to houses in the evening from 13 to 14 January; final, which form is transformed over time. Expressive local features of Davyd-Gorodok's "Koniki" traced through the analysis of its structure and ritual codes.*

***Key words:*** *"Koniki", caroling, attributive code, caroling song, chant, historical and cultural value of the Republic of Belarus.*

Старадаўні абрад «Конікі» існуе як жывая з'ява мясцовай культуры. Ён ладзіцца штогод з 13 на 14 студзеня ў г. Давыд-Гарадок Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. У народным календары гэтае ўнікальнае па прыгажосці свята вызначаецца як Шчадрэц. Традыцыя можа быць аднесена да абраду пераходу, пры дапамозе якога мясцовыя жыхары перадольваюць ламінарную стадыю існавання ў час павароту сонца на новае лета і пераходу на новы этап земляробчага календара [2, с. 15]. Абыходы двароў гуртамі з пажаданнямі дабрабыту суправаджаюцца маскарадным пераапрананнем, выкананнем шчадровак і хрысціянскіх кантаў, стварэннем шумаў пры дапамозе свісцёлак, дудак, званочкаў, горнаў і рознымі іншымі забавамі. З мэтай захавання каляднай традыцыі

ў 2019 г. давыд-гарадоцкія «Конікі» ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [1].

Абрад «Конікі» пакуль не знайшоў асэнсавання ў навуковым дыскурсе. Спробы апісання і выяўлення адметнасцей гэтай традыцыі зрабіла Т. І. Кухаронак [5; 6]. «Конікі» зафіксаваны і апісаны пераважна ў сродках масавай інфармацыі. Публікацыі журналістаў, напрыклад А. В. Цярэнцьевай [13], варта разглядаць як фактаграфічную базу і крыніцу візуальнай інфармацыі для вывучэння абраду. Для разумення лакальных асаблівасцей давыд-гарадоцкіх «Конікаў» уяўляюць цікавасць даследаванні калядавання і шчадравання на Украінскім Палессі В. Давідзюка [3], А. Панчук [9]. Аўтарам дадзенага артыкула ў 2022 г. праведзены палявыя даследаванні ў Давыд-Гарадку з мэтай збору інфармацыі аб мясцовым шчадраванні.

*Мэта артыкула* – вызначыць лакальныя асаблівасці шчадравання ў Давыд-Гарадку праз разгляд структуры, а таксама атрыбутыўнага, музычна-вербальнага, музычна-інструментальнага і пластычнага кодаў абраду «Конікі» і іх трансфармацый на сучасным этапе.

Выразная лакальная адметнасць давыд-гарадоцкіх «Конікаў» патрабуе асвятлення праблемы аўтэнтычнай традыцыі, выяўлення яе генезісу. Гістарычныя крыніцы не даюць адказу на гэтае пытанне. Апытанні жыхароў Давыд-Гарадка сведчаць аб трываласці мясцовых міфалагем пра звычай хаджэння з канём па дварах у Шчодры вечар. Бытуе версія, што гэтая традыцыя гістарычна ўзыходзіць да часу, калі ў гэтай мясцовасці жылі татары, габрэі і цыганы. Лічылася, што ў кожным двары павінны быць два кані: адзін прызначаны для працы (араць, вазіць, ездзіць), а другі (яго ўпрыгожвалі бантамі, кветкамі, каснікамі і вадзілі па вуліцы) – каб красавацца перад суседзямі. Перанятая беларусамі традыцыя з цягам часу змянілася і была прымеркавана да свята Шчадрэц.

Гарадчукі, як называюць жыхароў Давыд-Гарадка, лічацца на Століншчыне асаблівымі, «іншымі», адрозніваюцца ад палешукоў. З успамінаў П. І. Астапчука[1] вядома, што «Давыд-Гарадок – паселішча, у якое дабраліся крымскія татары, … была страшная бойня, … татараў пабілі воіны княгіні Вольгі. Прымушалі мужчын (татараў) станавіцца беларусамі – ажаніцца на мясцовых дзяўчатах, а то разаб'юць іх. Таму да нашага часу мясцовыя жыхары чорныя, як смоль, і часта сустракаюцца татарскія прозвішчы».

П. І. Астапчук мяркуе, што гэтая традыцыя паходзіць з ваенных часоў, бо ў аснове ляжыць фігура салдата з канём: «Абрад з'явіўся арыенціровачна больш за 100 гадоў таму, падчас Першай сусветнай вайны. У Давыд-Гарадку знаходзіліся два шпіталі расійскай арміі, і ў нейкі момант салдаты вырашылі павіншаваць мясцовых жыхароў са старым

[1] Інтэрв'ю І. Хамутовай з П. І. Астапчуком (нар. 1956), ураджэнцам в. Вялікія Арлы Столінскага раёна, 06.05.2022 г.

Новым годам. Яны пераапрануліся ў касцюмы (сярод якіх быў касцюм каня) і выйшлі на вуліцы. Гэта так спадабалася жыхарам, што ў далейшым яны самі пачалі так рабіць» [8]. На старонках перыядычнага друку можна сустрэць наступную версію: «Каб адагнаць нячысцікаў за межы паселішча, маладыя хлопцы гарцавалі на конях – тупат капытоў спрыяў выгнанню зла» [13, с. 26].

Паточная міфалагічная свядомасць жыхароў Давыд-Гарадка суадносіць паходжанне «Конікаў» з мінуўшчынай, вобразам ваяра-вершніка, падзеямі Першай сусветнай вайны, калі быццам бы пераапранутыя салдаты, каб атрымаць пачастунак, ладзілі святочны абыход двароў мясцовых жыхароў. Усе гэтыя версіі не знаходзяць пацвярджэння гістарычнымі фактамі. Раскрыць генезіс унікальнага лакальнага абраду і яго асаблівасці магчыма толькі шляхам гісторыка-параўнаўчых, структурна-тыпалагічных і семантычных даследаванняў мясцовай традыцыі шчадравання.

Засяродзім спачатку ўвагу на галоўных персанажах давыд-гарадоцкіх «Конікаў». Сам абрад атрымаў назву ад галоўнага персанажа свята – Коніка, які абавязкова ўваходзіць у склад гуртоў шчадроўшчыкаў. Па сведчанні мясцовых жыхароў, роля галоўнага Коніка перадаецца з пакалення ў пакаленне, ад бацькі да сына [12, с. 338].

Фігура коніка ўтвараецца з каркаса тулава з галавой каня, які мужчына, прыбраны ў маскарадны касцюм, апранае на сябе. Каркас тулава вырабляецца з двух лазовых кошыкаў, змацаваных паміж сабой, галава і шыя – з валёнка, усё абшываецца белай тканінай. Гэтую тканіну раней называлі «коленшчына» (пэўна, таму, што гэта была колішняя старая саматканая вынашаная і адбеленая з цягам часу прасціна або кусок палатна ад старой кашулі). Коніка ўпрыгожваюць чорнай грывай, якую робяць са старога кажуха. Чорным колерам малююць вочы каню. Для гэтага традыцыйна выкарыстоўваецца вугаль, а зараз ужо сустракаюцца і намаляваныя пры дапамозе маркера ці фламастара. На шыі каня замацоўваюць званочак і павады, якія трымае ў руках вершнік [1].

Выгляд вершніка (па-мясцоваму «ездавога» [5, с. 24]) можа адрознівацца з года ў год і ў розных гуртах «конікаў». Адзенне вершніка адлюстроўвае маскіраваную саслоўную прыналежнасць вобраза [Там жа, с. 18]. Яго можна ўбачыць у рыцарскай накідцы і капелюшы з пяром, у ахоўным шынялі і фуражцы з кукардай [11, с. 94], альбо ў вушанцы, а таксама з салдацкімі рамянямі. Апошнім часам сустракаюцца вобразы вершнікаў, далёкія ад традыцыйных, напрыклад у саламяным капелюшы і ў камізэльцы з сінтэтычнай тканіны насычанага жоўтага колеру і да т. п.

У іншых мясцінах на Палессі, напрыклад у в. Рог Салігорскага раёна Мінскай вобласці, у складзе гуртоў шчадроўшчыкаў прысутнічае конь у выглядзе лялькі. Выкарыстанне маскараднай фігуры каня

ў шчадраванні сустракаецца ў вёсках каля Слуцка, але яна адрозніваецца спосабам вырабу каркаса[2]. У Кракаве існуе традыцыя «Лайконікі», прымеркаваная да свята Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста (адзначаецца ў чацвер пасля Святой Тройцы), калі на вуліцы горада выходзяць пераапранутыя вершнікі на самаробных конях.

Улічваючы тое, што ў даўніну ў Давыд-Гарадку былі добра развітыя гандлёвыя і культурныя сувязі з іншымі народамі, можна выказаць здагадку, што гарадчукі маглі пераняць польскую традыцыю і прымеркаваць яе да мясцовага шчадравання.

Каб зразумець галоўную ролю каня ў давыд-гарадоцкай святочнай традыцыі звернемся да яго семантыкі ў міфалогіі беларусаў. Конь – адна з самых шанаваных жывёл, вобраз якой выкарыстоўваўся ў касмалогіі і кульце продкаў. Адзначаецца сувязь каня з Ярылам, гэта дае падставу меркаваць, што ён быў сімвалам сонечных багоў. Супастаўленне бога сонца і каня з'яўляецца агульнаіндаеўрапейскай міфалагічнай асаблівасцю [10, с. 252].

Традыцыйнымі персанажамі, акрамя Коніка, з'яўляюцца Дзед, Баба, Каза ці Казёл, Чорт, Баран, Мядзведзь, Бусел, Смерць і Скарбнік, семантыка якіх таксама мае міфалагічную аснову. У наш час, акрамя традыцыйных персанажаў, дадаліся казачныя і мультыплікацыйныя героі. Так, у 2022 г. у складзе гуртоў давыд-гарадоцкіх «конікаў» былі зафіксаваны і наступныя персанажы: Дзед Мароз, Снягурка, Павук, Мухамор, Дыназаўр, Панда, Кот, Гусар, Кракадзіл, Слон, Сабака, Елка, Пірат, Вадзянік, Клоўн, Баба Яга і інш. [12, с. 336]. Некаторыя з іх спарадзіла масавая культура (вобразы з папулярных кінафільмаў і мультыплікацыі). З'яўленне ў ролі галоўных герояў Дзеда Мароза і Снягуркі можна растлумачыць уздзеяннем культуры святкавання Новага года ў савецкі час.

Паводле структуры давыд-гарадоцкія «Конікі» праходзяць у некалькі этапаў. На падрыхтоўчым этапе ствараюцца індывідуальныя вобразы персанажаў шчадроўшчыкаў для абыходу двароў. Па сведчанні Мікалая Мікалаевіча Бразоўскага, настаўніка СШ № 1 Давыд-Гарадка, напярэдадні свята ён з навучэнцамі займаецца вырабам масак з пап'е-машэ, для гэтага загадзя рыхтуецца «форма з гліны, якая абклейваецца газетай, а зверху ўпрыгожваецца пап'е-машэ і расфарбоўваецца»[3]. Выкарыстоўваюцца і сучасныя матэрыялы, напрыклад бутэлькі з пластыку, каб зрабіць вобраз больш яркім, стварыць «вялікую маску», што не адпавядае традыцыйным уяўленням. Дзеці з цікавасцю ўключаюцца ў творчы працэс. Варта адзначыць, што на трансфармацыю традыцыйнага складу гуртоў «конікаў» уздзейнічаюць сучасныя карнавальныя касцюмы.

[2] Матэрыялы, выкарыстаныя ў артыкуле, сабраны В. А. Лабачэўскай.

[3] Інтэрв'ю Р. Гамзовіч з М. М. Бразоўскім (нар. 1964), майстрам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, 10.06.2010 г.

Як адзначалася вышэй, галоўная дзея і кульмінацыя абраду прыпадае на вечар 13 студзеня, калі шчадроўшчыкі апранаюць касцюмы, бяруць музычныя шумавыя інструменты (дудкі, горны, барабаны і інш.), гармонік і з разнастайнымі песнямі адпраўляюцца на вуліцы Давыд-Гарадка.

Акрэслім узроставы і гендарны склад удзельнікаў мясцовага шчадравання. Сустракаюцца групы «конікаў» рознага ўзросту і змешанага складу (мал.), школьнікаў і моладзі, сямейныя. У Давыд-Гарадку штогод такіх суполачак збіраецца больш за дзясятак, што сведчыць аб папулярнасці традыцыі сярод мясцовай моладзі. Як адзначаюць А. В. Мінёнак і С. П. Сарокіна, наяўнасць некалькіх «труп» на адной невялікай тэрыторыі характэрна для бытавання народнай драмы [7, с. 57], што актуальна ў дачыненні і да абраду «Конікі».

Маладзёжныя гурты часцей спяваюць папулярныя жартоўныя песні замест шчадровак, што сведчыць аб пераўтварэнні традыцыі ў карнавальную культуру. Шчадроўшчыкі заходзяць у хату, калі ў акне гарыць святло і адчынена брамка [11, с. 95]. Гэта з'яўляецца своеасаблівым знакам, што ў хаце гатовы сустрэць гурт «конікаў» і абдарыць пачастункам і грашамі. Увогуле, прыняць шчадроўшчыкаў у гарадчукоў лічыцца абавязковым, каб у наступным годзе былі шчасце і багацце. Але можа здарыцца так, што яны пагрукаюць у брамку, пагудзяць у горн, а гаспадары не адчыняць – у такім выпадку на апошніх нават маглі накласці праклён. Мінаюць «конікі» і тыя хаты, калі ў гэты год хтосьці там памёр.

Прывядзём прыклад давыд-гарадоцкай традыцыйнай шчадроўкі: «Там стояла сосна // Тонка, высока – // Шчодры вэчор. // Тонка, высока, // Лісцэйком шырока – // Шчодры вэчор. // А на той сосонцы // Золота корыца – // Шчодры вэчор. // Золота корыца, // Майская росіца – // Шчодры вэчор. // Ой, ды наляцелі // Райскія пташкі – // Шчодры вэчор. // Ды тую корыцу // Ўзялі позбівалі – // Шчодры вэчор…» [12, с. 338]. Песня налічвае больш за 20 куплетаў, запіс якіх захоўваецца ў мясцовым музеі, але цалкам яны не выконваюцца ўдзельнікамі шчадравання. Сюжэт шчадроўкі адсылае да касмаганічнага міфа і традыцыйнай трохпавярховай мадэлі сусвету [3, с. 105], дзе ў якасці святога дрэва выступае сасна з залатой карыцай і «райскімі пташкамі». Ва ўкраінскіх шчадроўках ужываецца паняцце «золота роса» і праследжваецца падабенства традыцый святочнага абраду [9, с. 29].

Важным этапам з'яўляецца працэс адорвання ўдзельнікаў гурта гаспадарамі пасля праслухвання шчадровак. Традыцыйна першым частаваўся Скарбнік (на сённяшні час гэтая роля перайшла да Дзеда Мароза), потым астатнія ўдзельнікі абыходу. Атрымаўшы пачастункі, шчадроўшчыкі пачынаюць весяліцца: Конік скача, музыкі граюць, астатнія ўдзельнікі гурта могуць праспяваць застольную песню: «А хто

п’е, тому налівайтэ, // Хто нэ п’е, тому нэ довайтэ, // Хто покажа ў чарцэ дно, // Таму шчасця і дабро» [12, с. 339].

Захаваўся і такі элемент абраду, калі Конік (а за ім рухаецца гурт) працягвае рухацца далей пасля таго, як атрымае пачастунак ад Скарбніка. Такія абрадавыя паводзіны галоўнага персанажа адсылаюць нас да рытуальнага памірання калядной казы і яе пераражджэння пасля атрымання пачастунку, што праз абрадавую дзею наглядна ўвасабляе ідэю перадолення смерці.

Развітваючыся, калядоўшчыкі жадаюць гаспадарам дабрабыту, шчасця, прыплоду і абавязкова прагаворваюць традыцыйную на Палессі формулу-пажаданне: «Дай, Божа, каб праз год дождалі!», – пасля чаго пад музыку пераходзяць у наступную хату.

Сустракаюцца і такія звычанні, як «Паздраўляем Вас з Новым годам! З новым шчасцем! Будзьце здаровы!», з выкананнем гуртом песні хрысціянскага паходжання, якая адносіцца да кантавай традыцыі: «Ой, запей ён песню // Слаўнаму пану. // Святы вэчор!…» (зафіксавана аўтарам артыкула ў 2022 г.) [Там жа, с. 340]. Калі шчадроўшчыкі атрымліваюць дары, яны на развітанне прыгаворваюць: «Святкуйце на здароўе! Каб праз год дождалі! Дай Бог здароўя!» [Там жа]. Як сцвярджае Л. Ф. Касцюкавец, на Палессі «на сённяшні дзень захавалася некалькі дзясяткаў калядных псальм, усе яны апакрыфічныя і вольна трактуюць евангельскі сюжэт» [4, с. 9].

Да трансфармаваных складнікаў давыд-гарадоцкага шчадравання трэба аднесці звычай перагароджвання дарогі транспарту. Спыніўшы машыну, гурты спяваюць вышэйзгаданую шчадроўку «Там стояла сосна тонка, высока» і жадаюць кіроўцам моцнага здароўя ў Новым годзе, за што апошнія адорваюць калядоўшчыкаў грашамі.

Традыцыйна пасля завяршэння абыходаў двароў шчадроўшчыкі ноччу ці на наступны дзень збіраюцца ў хаце аднаго з удзельнікаў і за святочным сталом частуюцца накалядаваным. У апошнія гады свята ў Давыд-Гарадку завяршаецца святочнай дыскатэкай, арганізаванай мясцовымі работнікамі культуры на плошчы каля помніка князю Давіду, дзе збіраюцца разам усе суполкі «конікаў», мясцовыя жыхары, адміністрацыя раёна, вобласці, а таксама запрошаныя госці. Праводзіцца агляд-конкурс гуртоў і масак, пасля якога гарадскі Дом культуры ўзнагароджвае пераможцаў у розных намінацыях [6, с. 277].

Такім чынам, лакальная асаблівасць традыцыі шчадравання «Конікі» ў Давыд-Гарадку ў першую чаргу раскрываецца праз атрыбутыўны код абраду – галоўная роля ў гурце належыць не Казе, што характэрна для калядавання на Заходнім Палессі, а персанажу Каня з пераапранутым Вершнікам. Роля Каня перадаецца з пакалення ў пакаленне гарадчукоў па мужчынскай лініі. Удзельнікі шчадравання імкнуцца стварыць адметныя, яскравыя вобразы, выкарыстоўваючы маскі, пе-

раапрананне, гатовыя касцюмы казачных герояў і роставых лялек. Кожны касцюміраваны шчадроўшчык імітуе пластыку рухаў, уласцівую яго персанажу (напрыклад, Конік скача), што характарызуе пластычны код абраду. Набор персанажаў пашыраецца, іх маскарадны воблік трансфармуецца пад уздзеяннем масавай культуры, акрамя традыцыйных, з'яўляюцца новыя вобразы. Музычна-вербальны код абраду захаваў традыцыю выканання шчадровак (у т. л. калядных кантаў) і іх тэксты. Музычна-інструментальны код выяўляецца праз выкарыстанне калядным гуртамі дудкі, гармоніка, барабана і горна як аднаго з галоўных музычных інструментаў.

Са сказанага вынікае, што абрад «Конікі» 1) набыў у Давыд-Гарадку масавы характар, у ім удзельнічаюць розныя слаі насельніцтва; 2) падтрымлівае традыцыю шчадравання, якая мае мясцовы каларыт; 3) захоўвае даўнейшыя і ўключае сучасныя элементы абраду.

*1.* Абрад «Конікі» (г. Давыд-Гарадок, Столінскі р-н, Брэсцкая вобл.) [Электронны рэсурс] // Жывая спадчына Беларусі : інвентар нематэр. культур. спадчыны. – Рэжым доступу: https://living-heritage.by/nks/7748/. – Дата доступу: 23.06.2022.

*2. Геннеп, А. ван.* Обряды перехода: систематическое изучение обрядов / А. ван Геннеп ; пер. с фр. Ю. В. Ивановой, Л. В. Покровской. – М. : Вост. лит., 2002. – 198 с.

*3. Давидюк, В.* Колись була Коляда / Віктор Давидюк // Поліська дома : фольклор.-діалектол. зб. / упорядкув.: В. Ф. Давидюк, Г. Л. Аркушин. – Луцьк, 1991. – Вип. 1. – С. 99–106.

*4. Костюковец, Л. Ф.* Фольклоризация канта / Л. Ф. Костюковец. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2014. – 178 с. : ноты.

*5. Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 239 с.

*6. Кухаронак, Т. И.* Современное состояние календарной обрядности белорусов (на примере рождественско-новогодних обходов) / Т. И. Кухаронак // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтва : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 28–29 лістап. 2013 г. : у 2 ч. / уклад.: Н. С. Бункевіч [і інш.]. – Мінск, 2014. – Ч. 2. – С. 275–279.

*7. Миненок, Е. В.* Белорусский обряд-представление «Колядные цари» / Е. В. Миненок, С. П. Сорокина // Традиц. культура. – 2015. – № 2. – С. 54–63.

*8.* «Наши “Коники” круче, чем Новый год»: один из самых необычных обрядов Беларуси [Электронный ресурс] // Живой журнал. – Режим доступа: https://dymontiger.livejournal.com/16654637.html. – Дата доступа: 27.06.2022.

*9. Панчук, О.* Волинські щедрівки / Оксана Панчук // Народна творчість та етнографія. – 2004. – № 1/2. – С. 27–30.

*10. Прохараў, А.* Конь / А. Прохараў // Беларуская міфалогія : энцыкл. сл. / склад. І. Клімковіч ; рэдкал.: С. Санько [і інш.]. – 2-е выд., дап. – Мінск, 2006. – С. 252–254.

*11. Терентьева, Е.* Открывайте ворота, «Коники» идут! / Елена Терентьева // Форум плюс. – 2021. – № 6. – С. 92–95.

*12. Хамутова, І.* Лакальныя асаблівасці заходнепалескай каляднай абраднасці на прыкладзе давыд-гарадоцкага абрадавага комплексу «Конікі» / Ірына Хамутова // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь [и др.] ; редкол.: В. И. Дунай [и др.]. – Пинск, 2022. – Вып. 6. – С. 336–340.

*13. Цярэнцьева, А.* Год будзе шчаслівым, калі прыдуць «Конікі» / А. Цярэнцьева // Алеся : Работніца і сялянка. – 2022. – № 1. – С. 25–27.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 21.11.2022.